# ГЕНАЦЫД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА (ДОКШЫЦКІ РАЁН)

*Пракаповіч В.Ю., Ясінскі П.М.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Сугака Н.А. – канд. гіст. навук, дацэнт*

Даследаваны матэрыял, што дапаўняе даныя аб генацыдзе беларускага народа ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці. Атрыманы набліжаныя лічбы страт сярод насельніцтва ў асноўных населеных пунктах раёна.

Падзеі Вялікай Айчыннай Вайны адгукаюцца ў сучаснай гісторыі Докшыччыны. Так, да 2022 года было вядома пра тры знішчаныя фашыстамі вёскі, якія не былі адноўлены пасля вайны: Шунеўка, Азарцы, Залатухі. Сёння дакладна вядома аб існаванні ды месцазнаходжанні чацвёртай – Баравыя. Звесткі ведамасцей Бягомльскага сельсавета ад верасня 1924 г. адкрылі зводку насельніцтва і гаспадаркі вёскі ў даваенны час – 22 зямельных участка і 96 жыхароў. У выніку, падчас расследавання крымінальнай справы, узбуджанай Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, пракуратура Докшыцкага раёна ўстанавіла: вёска Баравыя была сапраўды знішчана ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі [1].

Жудасны лёс Баравых паўтарылі 114 вёсак з агульнай колькасцю двароў 4632, расстралялі, спалілі жывымі, закатавалі 21 590 чалавек. Забойствы мірных жыхароў ажыццяўляліся ў працэсе карных фашысцкіх аперацый. Такім чынам, праз тэрыторыю Докшыцкага раёна прайшлі тры знішчальныя паходы: «Котбус» – з 20 мая па 21 чэрвеня 1943 г. , «Веснавое свята» – з 17 красавіка па 5 мая 1944 г., «Баклан» – з 25 мая па 23 чэрвеня 1944 г. [2].

Халакост і сёння застаецца страшнай плямай у гісторыі невялікага горада. Паводле перапісу 1939 г. насельніцтва Докшыц складала 3,6 тыс. чалавек, з якіх 75 % – яўрэі. З-за сумненняў аб жорсткасці фашыстаў, большая частка насельніцтва не пажадала эвакуявацца. Ужо 29 траўня 1942 г. створанае ў версані 1941 г. яўрэйскае гета ў Докшыцах было ліквідавана – знішчаны 2653 яўрэі. У чэрвені 1942 г. ў Докшыцах не засталося ніводнага яўрэя. Халакост ажыццяўляўся на ўсёй тэрыторыі Докшыцкага раёна, але знаходзіліся людзі, гатовыя да дапамогі. Так, 14 чалавек з раёна былі ганараваны звання «Праведнік народаў свету» – званне, якое прысуджаецца Інстытутам Яд Вашэм у Іерусаліме неяруэйскім грамадзянам, якія здзейснілі гераічныя ўчынкі, ратуючы яўрэяў падчас Халакосту.

Летам 1941 г. у Докшыцкім раёне было створана Параф'янаўскае гета. Тут за час акупацыі было знішчана каля 600 яўрэяў. 30 траўня 1942 г. з гор. Глыбокае прыехала нямецкая жандармерыя на ст. Параф'янава. Пасля збору яўрэяў у будынку клуба – тамсама на станцыі, іх павялі да ямы, дзе адбыўся масавы расстрэл. Так усё яўрэйскае насельніцтва станцыі Параф'янава было знішчана.

У чэрвені 1944 г., на фоне набліжэнні Чырвонай Арміі, гітлераўцы праводзілі масавыя карныя аперацыі супраць мірнага насельніцтва і партызан. У в. Ходараўка, недалёка ад станцыі Параф'янава, быў створаны канцлагер, дзе ўтрымваліся савецкія грамадзяне і італьянскія ваеннапалонныя. 27–28 чэрвеня 1944 г. нямецкія карнікі з «Зондэркаманды-9» правялі масавую расправу над зняволенымі. Людзей расстрэльвалі і скідалі ў ямы. Ахвярамі сталі каля 600 савецкіх грамадзянаў з Ушацкага, Лепельскага, Бягомльскага і іншых раёнаў, а таксама 200 італьянскіх ваеннапалонных [3].

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны пакінулі глыбокі след у гісторыі Докшыччыны. Карныя аперацыі фашыстаў і халакост сталі трагічнымі старонкамі, якія нагадваюць пра жорсткасць акупантаў і гераізм людзей, што ратавалі іншых. Гэтыя падзеі заахвочваюць шанаваць памяць ахвяр і захоўваць урокі гісторыі для будучых пакаленняў.

***Спіс выкарыстаных крыніц***

*1. Інтэрнэт-партал рэдакцыі газеты «Родныя вытокі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.dokshitsy.by. – Дата доступу: 22.03.2025.*

*2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага р-на. –Мн.: БелЭн, 2004. – С. 274-275.*

*3. Інфармацыйны рэсурс «Студапедыя» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://studopedia.ru. – Дата доступу: 22.03.2025.*